# ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАХ

**Падрыхтавала і правяла**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры Т.А. Талмачова**

**Мэта:** удасканаленне пунктуацыйных і сінтаксічных уменняў і навыкаў.

**Задачы:**

арганізаваць кантроль засваення тэмы школьнікамі;

развіваць мэтанакіраванасць, самастойнасць вучняў, іх аналітычныя навыкі, самакантроль, уменне працаваць з тэставымі заданнямі;

працягваць падрыхтоўку да ЦТ;

выхоўваць павагу да гісторыі краіны.

**Сродкі візуалізацыі:** табліцы, схемы і плакаты па тэме.

## Ход урока

**I. Стварэнне эмацыянальнага настрою. Уводзіны ў работу**

Уменне граматна выказваць свае думкі, будаваць сказы, дакладна ўжываць у іх знакі прыпынку – адзін з паказчыкаў, на аснове якога мяркуюць пра культуру чалавека. Гэтыя ўменні будуць сведчыць пра ўзровень вашай моўнай падрыхтоўкі. Канешне, на жаль, вы не выкарыстоўваеце беларускую мову ў паўсядзёных зносінах, але, помніце, я вам гаварыла неаднойчы, што сінтаксіс і пунктуацыя беларускай і рускай мовы вельмі блізкія. Гэтыя ўменні спатрэбяцца вам для паспяховай здачы ЦТ, а значыць, для паступлення ў ВНУ.

**II. Стварэнне праблемнай сітуацыі (тэма, мэта і задачы)**

Запішыце дату, класная работа. Мы працягваем працаваць над тэмай “ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАХ”.

Якія задачы паставім перад сабой на гэты ўрок?

Паўтарыць… складаназалежныя сказы як адзінкі сінтаксісу,

Замацаваць… правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў іх,

Развіваць… уменне пранаваць з тэстамі, арфаграфічную пільнасць.

Для развіцця арфаграфічнай пільнасці папрацуем над слоўнікавым дыктантам.

**Слоўнікавы дыктант.**

**з/с/ш/щ?**

Ужо адразу нічога не хочацца сказаць? Няма літары щ у беларускай мове, яе замяняе спалучэнне шч. Так і пры напісанні ЦТ, уважліва паглядзіце: магчыма, вы не можаце адразу дакладна сказаць, якія адказы правільныя, аднак адразу зможаце вызначыць, якія з іх дакладна НЕправільныя.

Напісаны на дошцы словы:

..часце, рэ..чык, гру..чык, ..чодры, зака..чык, раска..чык, пя..чотны, пра..чур, на..чадак, у..чуваць, зма..чык, пры..чаліць, пагру..чык, у..чыкнуць, ..чыльны,

Словы ўзяты з задання А7 ЦТ-2021 па беларускай мове. Шчасце, рэзчык, грузчык, шчодры, заказчык, расказчык, пяшчотны, прашчур, нашчадак, ушчуваць, змазчык, прышчапіць, пагрузчык, ушчыкнуць, шчыльны.

Як гучыць правіла? Прыпадабненне звонкіх да глухіх у корані слова (аглушэнне). Прыпадабненне свісцячых да шыпячых.

Назавіце прафесіі, якія сустрэліся вам у слоўнікавым дыктанце? Рэзчык, грузчык, змазчык. А пагрузчык?

Складзіце сінквейн з гэтымі словамі (3 хлопцы ля дошкі або хлопцы ў сшытках).

А як называецца прафесія чалавека, што выпраўляе памылкі ў тэкстах? (Карэктар, настаўнік, рэдактар).

Вазьміце словы, што схаваліся ў вас на партах, растлумачце іх лексічнае значэнне.

шчасце - счастье,
шчодры - щедрый,
пяшчотны – нежный,
прашчур - предок,
нашчадак - потомок,
ушчуваць - увещевать,
прышчапіць - привить,
ушчыкнуць - ущипнуть.
шчыльны - плотный.

Якое яшчэ слова на гэтае правіла ляжыць проста перад вамі на партах? Сшытак!

Запомніце правапіс гэтых слоў у беларускай мове. Яшчэ раз напамінаю, гэта заданне А7 ЦТ.

**Праверыць сінквейны.**

**III. Зварот да эпіграфа.**

Запісаць эпіграф у сшыткі: “Ні пыл вякоў, ні час не перашкода, калі нашчадак з продкам заадно”. Ларыса Геніюш

Перашкода - препятствие,
нашчадак - потомок,
продак - предок,
заадно – заодно, вместе, с одной целыо.

Як ны разумееце словы Ларысы Геніюш?

Ахарактарызуйце гэты сказ. (Складаны, таму што дзве граматычныя асновы: пыл, час не перашкода, нашчадак з продкам заадно. Складаназалежны, таму што часткі злучаны падпарадкавальным злучнікам

калі.)

Чаму не ставіцца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікамі? (Ёсць адмоўная часціца не.)

Запісаць у сшыткі сказ, дапісаць канцоўку.

2022 год у Беларусі аб’яўлены годам гістарычнай памяці, таму што...

**IV. Узнаўленне тэарэтычных ведаў**

**Адказаць на пытанні:**

- Які сказ называецца складаназалежным? (складаны сказ, часткі якога злучаны падпарадкавальным злучнікам)
- Назавіце віды даданых частак у складаназалежных сказах. (дапаўняльныя, азначальныя, акалічнасныя).
- Даданыя акалічнасныя часткі бываюць... (часу, мэты, прычыны, умовы, параўнальныя, уступкі, спосабу дзеяння, меры і ступені)
- Назавіце разнавіднасці падпарадкавання ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі. (паслядоўнае, сузалежнае, змешанае)
- Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі. (калі аднародныя даданыя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў і, ды(=і), або, ці, то паміж імі коска не ставіцца.)

**V. Графічны дыктант.** Настаўнік дыктуе складаназалежныя сказы, вучні адразу чэрцяць іх схему.

У гэты час некаторыя (слабапаспяваючыя вучні, 6 вучняў, працуюць над **практыкаваннем 158, сказы 1-6,** па аднаму).

Кожны куточак Беларусі багаты сваёй гісторыяй, культурай і спадчынай, якую мы павінны вывучаць, любіць і берагчы.

А веданне гісторыі сваёй малой радзімы — гэта той мінімум, якім павінен валодаць кожны адукаваны чалавек.

Добра і трэба ведаць гісторыю іншых краін, але найперш трэба ведаць гісторыю сваёй малой радзімы.

Апошні сказ які? Складаназлучаны. Трэба было рабіць яго схему? Не! Будзьце ўважлівыя.

**VI. Трэніровачны тэст**

Выканаўшы заданні, вы ацэніце, ці добра ведаеце тэму. Усе сказы ўзяты з заданняў цэнтралізаванага тэсціравання мінулых гадоў.

1. Адзначце складаназалежныя сказы:

1) Вавёрка знайшла старое дзятлава гняздо на елцы, куды і перанесла запасы – жалуды і шышкі.

2) Дыхнула сцюжа – і зямля закамянела, а рэчку закавала льдом.

3) З каго кпіла, смяялася, таму сама дасталася.

4) Дубнячок, што некалі дасягаў чалавечага росту, цяпер стаў суцэльнай дубровай.

5) Марознай зорнай ноччу на шашы то прасунуцца ціхія сані, то прамчыцца машына.

2. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі:

1) Хто многа вынес на вяку, загартаваўшы волю, табе на раны ў час пакут ён не падсыпле солі.

2) Мы чуем, як патрэскваюць ад марозу дрэвы.

3) Вось так і не знаю, які колер снегу сапраўдны.

4) Прыходзілі на адукацыю да настаўніка ўсе, хто толькі меў сэрца жывое.

5) Адразу кідаецца ў вочы, што гамяльчане берагуць свой горад і любяць яго.

3. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі:

1) Зайшлі ў першую хату, што трапілася на шляху.

2) Які майстар, такая і работа.

3) Сцёпка не такі, каб адразу здацца.

4) Уражанне такое, быццам знаходзішся недзе пад Рыгай.

5) У возера такія пакручастыя берагі, што адшукаць рэчышча ракі было не так проста.

4. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі:

1) Здзіўляе тое, як мог чалавек таго часу ўдала апрацоўваць прадметы з самага цвёрдага матэрыялу – крэменю.

2) Паглядзім цяпер, што робіцца на дарогах ад Масквы на захад.

3) Ляцім мы павольна і нізка, каб не згубіць дарогу.

4) Ты чуеш, дружа, як плачуць журавы над зарывам асенніх журавін?

5) Таго не чуў наш Ясь ніколі, хоць быў чатыры гады ў школе.

5. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі:

1) У тым месцы, адкуль час ад часу даносіліся хлюпанне і шалясценне, захіналі небасхіл пышныя кусты лазы.

2) Людзі, якія тут жывуць, займаюцца не толькі паляваннем і рыбнай лоўляй, але і земляробствам.

3) Леанід Аляксандравіч ішоў сцежкай, што вілася ад лесу, і нёс вядзерца бярозавіку.

4) Свішчуць птушкі над балотам, аж гамоніць лес і гай.

5) Якое карэнне, такое насенне.

6. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі:

1) Цэлыя вякі стаяла пушча і радавалася, што навакал згода і супольнае жыццё.

2) Апошні шанц дала гісторыя, каб не спыніўся ў вечнасць лёт тваіх

надзей.

3) Толькі на вялікай адлегласці можна адчуць, якая вялікая любоў да родных мясцін жыве ў чалавечым сэрцы.

4) Сядай-ка бліжэй да мяне, бо я ўжо не дачуваю.

5) Шасейная дарога, якая праходзіла праз горад, была захоплена фашыстамі.

Самаправерка (адказы на лісце на дошцы)
1 – 134
2 – 145
3 – 234
4 – 24
5 – 123
6 – 124

Устаньце, у каго няма памылак… і г.д.

Назавіце сказы з тэста, якія адносяцца да тэмы гістарычнай памяці.

Дубнячок, што некалі дасягаў чалавечага росту, цяпер стаў суцэльнай дубровай.

Хто многа вынес на вяку, загартаваўшы волю, табе на раны ў час пакут ён не падсыпле солі.

Адразу кідаецца ў вочы, што гамяльчане берагуць свой горад і любяць яго. Здзіўляе тое, як мог чалавек таго часу ўдала апрацоўваць прадметы з самага цвёрдага матэрыялу – крэменю.

Людзі, якія тут жывуць, займаюцца не толькі паляваннем і рыбнай лоўляй, але і земляробствам.

Якое карэнне, такое насенне.

Людзі, якія тут жывуць, займаюцца не толькі паляваннем і рыбнай лоўляй, але і земляробствам.

Цэлыя вякі стаяла пушча і радавалася, што навакал згода і супольнае жыццё.

Апошні шанц дала гісторыя, каб не спыніўся ў вечнасць лёт тваіх надзей.

Толькі на вялікай адлегласці можна адчуць, якая вялікая любоў да родных мясцін жыве ў чалавечым сэрцы.

Шасейная дарога, якая праходзіла праз горад, была захоплена фашыстамі.

**VII. Замацаванне.**

**1. Дыягнастычны тэст**

Выпішыце ў сшыткі толькі граматычныя асновы сказаў. Напамінаю, што выпісваем мы друкаванымі літарамі, такімі, як будзем карыстацца пры запаўненні часткі В бланка ЦТ.

1) У хату дзе мы адпачывалі, забег разведчык і сказаў што мяне

пытаецца якісьці малады юнак. (збыткоўна выкарыстанае слова “малады”, таму што “юнак” – гэта малады хлопец)

2) Узгоркі на якіх размешчаны горад з’яўляюцца часткай Мазырскай грады якая ўзвышаецца над Палескай нізінай.

3) І для нас вялікі гонар што ўсюды ўшаноўваюць памяць пра чалавека які дарэчы друкаваў кнігі на беларускай мове.

4) Зніклі канчаткова апошнія сляды ледавіка калі не лічыць шматлікіх азёр балот і тых вялікіх камяняў-валуноў якія захаваліся і да нашага часу на палях паўночнай часткі Беларусі.

5) Юрасю здавалася што бацька і Мальва адчувалі на гэтай дарозе тое ж што адчуваў ён.

6) Калі назаўтра на досвітку мы з тымі кашамі выйшлі ў халодны туманны паўзмрок лесу каб наведаць ураджайны дубнячок то выявілі што лясная леснічоўка наша ў асадзе. (збыткоўна выкарыстанае слова “лясная”, таму што “леснічоўка” – гэта збудаванне ў лесе)

2. Правільная схема сказа (знакі прыпынку не пастаўлены):

У сутках ёсць пара такая калі зары палоска гасне і змрок спаўзае пад адхон калі становіцца няясным як летуценне лёгкі сон.

1) [ ]: (калі…), і (…), (калі…).

2) [ ], (калі…) і (…), (калі…).

3) [ ], (калі…), і [ ], (калі…).

3. З якога твора радкі? Знайдзіце складаназалежныя сказы, зрабіце іх схемы.

“О, Беларусь!..” - няхай усклікну
І я за волатамі ўслед.
Як пілігрым нясе малітву,
Так я нясу іх запавет.

Не знаю слоў, каб растлумачыць,
Разгадку тайны праявіць,
Чаму штодня мне трэба бачыць
Твой непаўторны краявід.

4. Выразна прачытайце верш Генадзя Бураўкіна і выпішыце з яго складаназалежныя сказы:

Мы дома песень менш знаходзім,
Удалеч шлях кіруем свой.
На поўнач едзем і на поўдзень,
Бліжэй да кедраў і секвой.

А там, дзе першы крок рабілі,

Дзе нашы мацеркі жывуць,
Растуць бярозы і рабіны
І лісце падае ў траву.

Ды мы наіўна прывыкаем,
Што нам спатрэбіцца пасля
Прашытая баравікамі,
Смалой прапахлая зямля.

Шукаем сцежак невядомых,
Чужыя топчам бальшакі.
А песні нас чакаюць дома,
Ля цёплай
матчынай шчакі.

**VIII. Рэфлексія**

Скласці складаныя сказы

Я вывучаю беларускую мову для таго, каб...

Нягледзячы на ранейшыя прабелы ў маіх ведах, я...

Я хачу паступіць ва ўніверсітэт, таму што...

Мая будучыня пачынаецца ўжо сёння, бо...

**IX. Каменціраванае выстаўленне адзнак**

**X. Дамашняе заданне**

https://adukar.com/by/test/start/tst718

Выканаць тэст. Скрыншот адказаў даслаць на вайбер настаўніку, каб былі відаць прозвішча, час выканання, вынік.

Або: Параграф 12, пр. 171.